Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і аблвыканкома.

Год выдання другі.

№ 52 (121)
ПАНЯДЗЕЛАК
4
САКАВІКА
1940 г.

Цана 10 капеек

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

КЛАПАЦІЦЦА АБ РАЗВІЦЦІ МАСТАЦТВАЎ ЗАХОДНІХ АБЛАСЦЕЙ БССР

Карэнным чынам пераўтвараецца жыццё працоўных заходніх абласцей БССР. Дзякуючы брацкай дапамозе Совецкага Саюза народы былой калоніі польскай «дзяржавы» зажылі шчасліва, робяць сваё жыццё такім, як жыццё ўсяго вялікага совецкага народа.

У былой Заходняй Беларусі польскія магнаты і буржуі ўсімі мерамі і сродкамі аж да фізічнага ўздзеяння знішчалі беларускую культуру, закрывалі беларускія школы, тэатры, мастацкія ўстановы, выступалі супроць мовы і звычаяў народных. Для іх нявыгадным было развіццё культуры народа, яе рост. Гэта магло хутчэй будзіць рэвалюцыйныя думкі, узбагачаць свядомасць працоўных, якія не пацерпяць панскага сваволля, узнімуць сцяг вызваленчай барацьбы.

Мары народныя ажыццявіў вялікі совецкі народ і яго гераічная Чырвоная Армія, якая назаўсёды вызваліла працоўных былой Заходняй Беларусі і адкрыла перад імі шырокія магчымасці для творчай дзейнасці, творчага росквіту. Уступілі ў строй соцыялістычныя прадпрыемствы — без капіталістаў і банкіраў, вольна ўздыхнулі вызваленыя землі без князёў і памешчыкаў, бурным ключом забілі крыніцы народнай самадзейнасці.

Усяго каля двух месяцаў прайшло з часу апублікавання рашэння бюро ЦК КП(б)Б аб арганізацыі ўстаноў мастацтва ў заходніх абласцях. Але якія вялікія змены ўжо адбыліся ў творчым жыцці, у мастацкім абслугоўванні насельніцтва! Вызвалены народ упершыню атрымаў найшырэйшую магчымасць азнаёміцца з выдатнымі дасягненнямі совецкага тэатра, музыкі, выяўленчага мастацтва, з росквітам усіх відаў і галін культуры — нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зместу. Заходнія абласці нашай рэспублікі ўжо атрымалі новыя тэатры, музыкальныя ўстановы, дамы народнай творчасці. З першых-жа дзён арганізацыі новыя калектывы прыступілі да пладатворнай работы. Так, Гродненскі яўрэйскі тэатр ажыццявіў ужо прэм'еру «Тэв'е малочнік» Шолам Алейхема, якую насельніцтва горада цёпла сустрэла.

Большэвіцкая партыя, совецкі ўрад, праяўляючы выключна вялікія клопаты аб культурным росце вызваленага народа, не толькі падтрымліваюць існаваўшыя мастацкія калектывы і кадры, але і даюць ім поўную магчымасць далей развівацца. Дастаткова сказаць, што на развіццё мастацтва ў заходніх абласцях у адным толькі бягучым годзе ўжо адпушчана 10 млн. рублёў дзяржаўных сродкаў, не лічачы вялікіх сродкаў, якія асігнаваны мясцовымі ўпраўленнямі да гэтага часу.

Праведзен рад практычных мерапрыемстваў па забеспячэнню новаарганізаваных мастацкіх устаноў адміністрацыйным і мастацкім кіраўніцтвам. Упраўленнем па справах мастацтваў пры СНК БССР падабраны дырэктары тэатраў і музыкальных устаноў, мастацкія кіраўнікі, рэжысёры, педагогі для музыкальных школ і вучылішчаў, дырыжоры для філармоній, кіраўнікі дамамі народнай творчасці і т. д.

Усе мерапрыемствы, праведзеныя партыяй і совецкай уладай па забеспячэнню культурнага абслугоўвання працоўных заходніх абласцей БССР, ужо даюць свае радасныя і выдатныя вынікі. Гэта асабліва прадэманстравана на алімпіядах, якія адбыліся ў многіх раёнах і гарадах заходніх абласцей. Алімпіяды паказалі быстры росквіт талентаў з народа, паказалі, наколькі жыватворчы прамені сталінскага сонца, пад якімі ажывае ўсё яркае і выдатнае, крэпне здаровы струмень народнай ініцыятывы і самадзейнасці. Алімпіяды з поспехам прадэманстравалі прыгожасць беларускай народнай песні, беларускага народнага танца, яны ўскрылі новыя, невычарпальныя крыніцы радаснай і таленавітай творчасці.

Гэта-ж дало магчымасць рашаць пытанне ўжо зараз аб удзеле мастацкай самадзейнасці працоўных заходніх абласцей у радасным святе беларускага народа — дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве. Трэба спадзявацца, што таленавітыя і высокамастацкія творчыя калектывы самадзейнасці заходніх абласцей БССР будуць удзельнічаць у заключным канцэрце дэкады і з поспехам прадэманструюць сваё майстэрства.

Першыя поспехі трэба адзначыць і ў галіне выяўленчага мастацтва заходніх абласцей. Тут зараз рыхтуюцца і будуць праводзіцца раённыя і абласныя выстаўкі выяўленчага мастацтва, у якіх мастакі пакажуць свае лепшыя работы, прысвечаныя гераічнай Чырвонай Арміі, совецкаму народу, новаму жыццю, вялікаму Сталіну. Трэба толькі, каб гэтыя выстаўкі былі сур'ёзна падрыхтаваны, каб на іх была звернута ўвага ўсіх мясцовых партыйных і совецкіх органаў.

Клапаціцца аб развіцці мастацтваў у заходніх абласцях БССР — гэта значыць змагацца за культурнае абслугоўванне працоўных, за іх ідэйны і палітычны рост, за паспяховае будаўніцтва новага, шчаслівага жыцця. Пад кіраўніцтвам нашых партыйных арганізацый гэта задача можа і павінна быць з поспехам вырашана.

(Скарочаны перадавы артыкул газ. «Звязда»).

—«о»—

АПЕРЗВОДКА ШТАБА ЛЕНІНГРАДСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ

На працягу 2 сакавіка на Карэльскім перашыйку наступленне нашых часцей працягвала паспяхова развівацца. Нашы часці занялі дэпо чыгуначнай станцыі **Выбарг** і паўднёвую частку горада Выбарга і абходзяць горад Выбарг з поўначы і з поўдня, захапіўшы станцыю **Таммісуо** на поўначы ад Выбарга, мыс **Кейхясніемі** і востраў **Туркінасадры** на паўднёвы захад ад Выбарга. Акрамя таго на ўсходзе ад Выбарга нашы часці занялі мястэчкі **Каянтыма** і **Лапінлахці.**

На астатніх участках фронта нічога істотнага не адбылося.

Наша авіяцыя вяла актыўныя дзеянні па войсках і ваенных аб'ектах праціўніка. У адбыўшыхся паветраных баях збіта 7 самалётаў праціўніка.



На здымку: Сяргей Осіпавіч Прытыцкі — кандыдат у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР. (Фота Сапір).

Сустрэча кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР Сяргея Осіпавіча Прытыцкага з выбаршчыкамі

29 лютага ў механічным цэху дэпо Валкавыск адбылася сустрэча кандыдата ў дэпутаты Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР тав. С. О. Прытыцкага з выбаршчыкамі-чыгуначнікамі Валкавыскага вузла. На сходзе прысутнічала больш 400 работнікаў дэпо, станцыі і дыстанцыі пуці.

Сход, прысвечаны сустрэчы з кандыдатам, адкрыў старшыня мясцкома паравознага дэпо тав. Карчагін, які прадаставіў слова кандыдату ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР тав. Прытыцкаму. Сяргей Осіпавіч расказаў выбаршчыкам аб сваім жыцёвым шляху.

Пасля яго выступлення першым узяў слова слесар дэпо тав. Кананові. Ён сказаў:

— Для нас сёння радасны дзень удвая. Сёння да нас прыбыў кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР тав. Прытыцкі. Сёння-ж мы атрымліваем пераходны чыгуначны чырвоны сцяг за першыя вытворчыя поспехі. Мы, выбаршчыкі-чыгуначнікі, горача падтрымліваем пастанову акруговай выбарчай камісіі аб зарэгістраванні Сяргея Осіпавіча Прытыцкага кандыдатам у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР і будзем усе, як адзін, галасаваць 24 сакавіка за дастойнага кандыдата сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, вернага сына народа, Сяргея Осіпавіча Прытыцкага.

Я заклікаю арганізаваць дастойную сустрэчу гэтага дня. Давайце разгорнем спаборніцтва за выкананне да гэтага дня сакавіцкай вытворчай праграмы.

Пасля тав. Кананові выступілі столяр тав. Владыка, стрэлачнік тав. Бутрыла і слесар тав. Федарук. Усе яны ад імені выбаршчыкаў выказвалі поўнае задаволенне вылучэннем кандыдатуры тав. Прытыцкага ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР і заверылі, што выбаршчыкі будуць галасаваць за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Тав. Прытыцкі, які выступіў у заключэнне, дзякаваў выбаршчыкам за давер'е і абавязаўся аддаць усе свае сілы, а калі будзе трэба, і жыццё, на дабро сваёй соцыялістычнай радзімы.

(„Западная Магистраль").

Сустрэча кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР Нікалая Сцяпанавіча Іванова з выбаршчыкамі

Другога сакавіка адбылася сустрэча выбаршчыкаў 41-га выбарчага ўчастка з кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Івановым Нікалаем Сцяпанавічам.

Сход адкрыў намеснік старшыні ўчастковай выбарчай камісіі тав. Ратлін. Пасля кароткага даклада аб задачах выбаршчыкаў у надыходзячых выбарах выступіў кандыдат у дэпутаты Нікалай Сцяпанавіч Іваноў.

Прамова тав. Іванова

—Доўгі час працоўны народ Заходняй Беларусі цярпеў нязносныя здзекі капіталістычнага рабства. Але гаспадаранню масціцкіх і іншага панскага зброду раз і назаўсёды пакладзен канец. Воляй гераічнага брацкага народа краіны соцыялізма нам створана свабоднае жыццё, гаспадарамі якога з'яўляемся мы самі працоўныя. І вось зараз, на аснове самай дэмакратычнай у свеце Сталінскай Канстытуцыі, мы рыхтуемся да выбараў прадстаўнікоў народа ў совецкі парламент.

Таварышы выбаршчыкі! Вы аказваеце мне, простаму рабочаму, вялікую чэсць і давер'е, вылучыўшы кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. І калі па вашай волі я атрымаю высокае званне дэпутата, я аддам усе сілы, каб з чэсцю апраўдаць давер'е працоўных. Буду аддана працаваць на карысць працоўных, на карысць нашай магутнай соцыялістычнай радзімы.

* * *

На сходзе выступілі таварышы Муравіцкая, Лава, Ганц і іншыя. Работніца 2-га Беластоцкага тэкстыльнага камбіната т. Муравіцкая ў сваім выступленні заявіла:

— Надыходзіць знамянальны дзень у нашым жыцці. 24 сакавіка ўпершыню мы, маладыя грамадзяне краіны Советаў, будзем выбіраць сваіх прадстаўнікоў у вышэйшыя органы совецкай улады. Сёння мы сустракаемся з нашым кандыдатам тав. Івановым. Ён выхадзец з працоўнага народа, верны сын радзімы. Я заклікаю ўсіх выбаршчыкаў нашага ўчастка ў дзень выбараў прыйсці да выбарчай урны і аддаць свае галасы за кандыдата сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, за Нікалая Сцяпанавіча Іванова.

Д. Еўдакімаў.

ПЕРШАЯ РАЁННАЯ НАРАДА РАБСЕЛЬКОРАЎ

Другога сакавіка ў Заблудаве адбылася першая раённая нарада рабселькораў і членаў радкалегій насценных газет, скліканая райкомам партыі. Нарада абмеркавала пытанне аб удзеле рабселькораў і насценгазет у выбарчай кампаніі.

Многія з прысутнічаўшых на нарадзе рабселькораў і членаў рэдкалегій працуюць агітатарамі на выбарчых участках.

Выступіўшы ў спрэчках селькор Андрэй Шымчук з вёскі Войшкі заклікаў селькораў быць асабліва пільнымі.

— Наша задача, — гаворыць ён, — рашуча выкрываць варожыя элементы, якія імкнуцца шкодзіць нам у паспяховым правядзенні выбараў.

Нарада намеціла рад мерапрыемстваў па наладжванню работы несценгазет і ўдзелу рабселькораў у выбарчай кампаніі.

ПА СОВЕЦКАМУ САЮЗУ

ПЕРАСЯЛЕНЦЫ З УКРАІНЫ

Комсамольск-на-Амуры. З Жытомірскай вобласці ў Комсамольскі раён прыбылі 54 калгаснікі - перасяленцы. Яны займуцца будаўніцтвам дамоў для сваіх сем'яў. У маі гэтага года чакаецца прыбыцце 51 сям'і. Для будаўніцтва жыллёвых дамоў калгасамі раёна загатоўлен лесаматэрыял. Кожнай сям'і на будаўніцтва дома і набыццё каровы вызначана па 13.600 рублёў.

НОВЫЯ СТАНКІ І АГРЭГАТЫ

Харкаў. Станкабудаўнічы завод ім. Молатава вырабіў вопытную серыю агрэгатных станкоў - поўаўтаматаў, маючых вялікае значэнне для развіцця многастаночнага руху. На адным станку можна адначасова свідраваць, наразаць, рабіць дробную фрэзероўку і іншыя работы. Станок забяспечан пазіцыйным сталом. На ім устанаўліваюцца 5 дэталей, адначасова падвержаных апрацоўцы. Адзін рабочы можа абслужыць 5 станкоў. Прадукцыйнасць іх —ад 50 да 200 дэталей ў гадзіну.

СПАБОРНІЦТВЫ ПАЛЯЎНІЧЫХ ПА СТРАЛЬБЕ І ГРАНАТАМЯТАННЮ

Кіеў. Звыш 60 паляўнічых Кіева прынялі ўдзел у двухдзённых комплексных спаборніцтвах па стэндавай стральбе, стральбе з дробнакаліберкай вінтоўкі і гранатамятанню.

Першае месца па ўсяму комплексу заняў палкавы камісар Куфшынаў, які набраў 71,6 ачка з 84 магчымых.



На здымку: Байцы Н-скага пагранатрада ў нарадзе (Заходняя граніца СССР) па ахове дзяржаўнай граніцы
На пярэднім плане — І. Г. Неклюдаў. (Фота-клішэ ТАСС).

«ПРАБЛЕМЫ АРКТЫКІ»

Ленінград. Усесаюзны арктычны інстытут здаў у друк другі нумар журнала «Праблемы Арктыкі», цалкам прысвечаны гераічнаму дрэйфу «Седова». Журнал адкрываецца артыкуламі Герояў Совецкага Саюза І. Д. Папаніна — «З імем Сталіна» і К. С. Бадзігіна — «Перамога совецкай навукі».

МУЗЫКАЛЬНЫ ЛЕКТОРЫЙ

Калінін. Для байцоў, камандзіраў, палітработнікаў і членаў іх сямей пры Калінінскім акруговым Доме Чырвонай Арміі арганізаван музыкальны лекторый. Адбыліся два канцэрты з твораў Глінкі, Мусоргскага і Рымскага - Корсакава.

ТУРБІНЫ ДЛЯ КАЛГАСНЫХ ГІДРАЭЛЕКТРАСТАНЦЫЙ

Сінельнікава, (Днепрапятроўская вобласць). Завод «Прагрэс» асвоіў вытворчасць маламоцных турбін для калгасных гідраэлектрастанцый. Першая накіравана ў Маскву на выпрабаванне. У гэтым годзе будзе выпушчана 50 турбін. (ТАСС).

ЧЭМПІЁНЫ СССР ПА ХАКЕЮ

2 сакавіка на стадыёне «Дынамо» ў Маскве адбылося пераігрыванне фінальных матчаў на кубак СССР паміж мужчынскімі камандамі «Дынамо» і «Буравесніка» і камандамі «Буравесніка» і «Спартака».

МАТЧ ЛЕВЕНФІШ — АЛАТАРЦАЎ

2 сакавіка ў Маскве даігрывалася восьмая партыя матча на званне гросмайстра СССР. На 73-м ходзе Левенфіш адклаў партыю ў безнадзейнай для сябе пазіцыі. У адкладзеным становішчы ў Алатарцава лішняя ладдзя.

Восьмая партыя будзе даіграна ў Ленінградзе, дзе адбудуцца дзевятая, дзесятая і адзінаццатая партыі, пасля чаго шахматысты звернуцца ў Маскву, дзе і закончаць матч. (ТАСС).

ЖАНЧЫНЫ - ВЫДАТНІЦЫ ГРАМАДЗЯНСКАГА ПАВЕТРАНАГА ФЛОТА

Шматтысячны калектыў актывістак-жонак работнікаў Грамадзянскага паветранага флота сустракае Міжнародны жаночы дзень — 8 сакавіка — буйнымі поспехамі ў сваёй вучобе і грамадскай рабоце. У Таджыкістане, Тамбове, Маскве, Ленінградзе, Новасібірску выпушчана звыш 100 жанчын - радыёапаратараў. Сотні хатніх гаспадынь атрымалі на курсах кваліфікацыю ўкладчыц парашутаў, вывучылі спецыяльнасці лабарантаў, шофераў, токараў, медыцынскіх сясцёр. Цяпер на курсах навучаецца 2300 актывістак і ў абаронных гуртках — каля 3500 чалавек.

Начальнік Галоўнага ўпраўлення Грамадзянскага паветранага флота, Герой Совецкага Саюза тав. Молакаў 12 актывістак Ленінграда ўзнагародзіў значком «Выдатніку Аэрафлота».

24 САКАВІКА ВЫБАРЫ Ў ВЯРХОЎНЫЯ СОВЕТЫ СССР І БССР

ВЫБАРШЧЫКІ 359 ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ ПА ВЫБАРАХ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ БССР, УСЕ, ЯК АДЗІН, АДДАВАЙЦЕ СВАЕ ГАЛАСЫ ЗА ВЕРНАГА СЫНА БОЛЬШЭВІЦКАЙ ПАРТЫІ, ГРЫГОРЫЯ МАЙСЕЕВІЧА ГЕРШМАНА!

Грыгорый Майсеевіч Гершман

(БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС)

Грузавік пераехаў лінію былой дзяржаўнай граніцы. З усіх бакоў бягуць сяляне — старыкі і старухі, моладзь і дзеці. У руках чырвоныя сцягі, кветкі... Са слязамі радасці на вачах яны паціскаюць рукі, абнімаюць і цалуюць...

Вось яны — самыя хвалюючыя, самыя незабываемыя хвіліны ў жыцці Грыгорыя Майсеевіча Гершмана — члена вялікай партыі Леніна—Сталіна, большэвіка, які адным з першых прыехаў у вызвалены Беласток, каб дапамагчы працоўным будаваць велічны будынак комунізма.

— Ужо шосты месяц у Беластоку, а я ўсё яшчэ знаходжуся пад уражаннем першых сустрэч. Яны ўлілі ў мяне такую энергію, што, здаецца, працаваў-бы і працаваў,— расказвае тав. Гершман. — Як цяпер бачу: радасныя, усміхаючыяся твары, працягнутыя рукі, простыя, усхвалёваныя словы. Так і хацелася абняць іх усіх, аддаць усё, каб зрабіць іх найшчаслівейшымі на зямлі.



Жыццёвы шлях Грыгорыя Майсеевіча— тыповы ў краіне соцыялізма. Гэта—прадстаўнік самых нізоў працоўнага народа, узняты партыяй і совецкай уладай да ўзроўню кіраўніка.

* * *

Грыгорый Майсеевіч Гершман нарадзіўся ў 1904 годзе ў глухой палескай вёсцы Ламовічы. Бацька — патомствены сельскі шавец. І прадзед быў шаўцом, і дзед быў шаўцом. Пяць дзедавых сыноў таксама былі шаўцамі. Страшэнныя хваробы — трахома і каўтун — вандравалі тады на Палессі. Ад трахомы аслеп дзед. Трахомай перахварэла амаль уся многалікая сям'я.

Сям'я жыла ў вялікай нуждзе. Нужда даходзіла та таго, што ў час вучобы Грыгорый Майсеевіч вымушан быў харчавацца ў жыхароў мястэчка Азарычы па чарзе: адзін дзень у адным доме, другі — у другім. Усё-ж у 1914 годзе ўдалося скончыць царкоўна-прыхадскую школу, якая дала вельмі мала ведаў. Жаданне вучыцца далей было вялікае, але замест далейшай вучобы прышлося сесці на калодку і дапамагаць бацьку-шаўцу.

1914 год быў жудасным у сям'і Гершманаў. Бацьку забралі на імперыялістычную вайну. Засталося васьмёра дзяцей, старэйшаму з якіх было 15 год, сляпы дзед і старая бабулька. Трэба было ісці на ўласны хлеб. 11-гадовы Грыша працаваў на розных работах — пасвіў жывёлу, дапамагаў старэйшаму брату латаць стары абутак.

Так праходзіла дзяцінства.

К 1910 году ў вёсцы Ламовічы развялося два шаўцы. Прышлося пераехаць у сяло Граб'ё.

Змалку Грыгорыя Майсеевіча мучыла пытанне, чаму гэта ў адных — вялікія абшары, а ў другіх вузенькія палоскі зямлі, па якіх з адной бараной цяжка праехаць? І калі пасля рэволюцыі дзялілі папоўку (уладанні граб'ёўскага папа), 16-гадовы Грыгорый прымаў актыўны ўдзел у гэтым раздзеле.

Жыццё тав. Гершмана, пачынаючы з 1919 года, цесна звязана з ленінска-сталінскім комсамолам, з большэвіцкай партыяй.

15-гадовы юнак быў адным з ініцыятараў стварэння Карпілаўскай комсамольскай арганізацыі, якая канчаткова была аформлена ў 1920 г. У час белапольскай акупацыі малады комсамолец Грыгорый Гершман разам з таварышамі ідзе ў партызанскі атрад № 4, які потым уліўся ў 72 полк 8-й стралковай дывізіі. К 14-й гадавіне Кастрычніка Мінскі горсовет узнагародзіў тав. Гершмана за ўдзел у партызанскім атрадзе пачотнай рэволюцыйнай граматай.

Вясной 1921 года на вёску напала банда Кісялёва. Маці Грыгорыя збілі да поўсмерці. Сям'я ўцякла ў м. Глуск. Разам з дваюрадным братам Грыгорый Гершман пешшу ідзе ў Бабруйск і там паступае ў чырвонаармейскі універсітэт. Як актыўнага комсамольца яго пасылаюць затым у бабруйскую раённую соўпартшколу, якую тав. Гершман паспяхова канчае.

У 1923 годзе тав. Гершмана прымаюць кандыдатам у члены вялікай партыі Леніна—Сталіна. К гэтаму часу тав. Гершман быў ужо членам Бабруйскага укома комсамола.

Маладога партыйца пасылаюць у Парычы сакратаром комсамольскай арганізацыі. Тав. Гершман праводзіць вялікую работу сярод батракоў, уцягвае іх у актыўнае комсамольскае жыццё. За адно толькі лета 1923 года ў комсамол было прынята 35 батракоў.

Восенню 1926 года тав. Гершмана прызываюць у рады Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Ён служыць артылерыстам 27 палка ў Віцебску. Адначасова з'ўляецца сакратаром парторганізацыі батарэі, членам партбюро палка.

Выхаванца Чырвонай Арміі накіроўваюць у 1928 годзе для работы ў ЦК ЛКСМБ, а пасля XIII з'езда партыі — у ЦКК і РСІ. XIV з'ездам партыі тав. Гершман выбіраецца членам ЦКК. Годы работы ў ЦКК — гэта годы барацьбы з трацкісцкімі і іншымі вырадкамі, барацьбы за чыстату радоў нашай партыі. На гэтай адказнай рабоце тав. Гершман праявіў сябе стойкім ленінцам, да канца адданым справе Леніна-Сталіна.

Рашэннем ЦК КП(б)Б тав. Гершман мабілізуецца на кіруючую паліт-работу ў авіяцыю, дзе працуе да 1935 года.

У 1936 годзе тав. Гершмана назначаюць упаўнаважаным трэста Каўчуканос па БССР. Праблема натуральнага кайчуку мае для нашай краіны выключнае значэнне. Партыя даручае тав. Гершману справу ўкаранення на палях Беларусі каўчуканоснай культуры кок-сагіз, знойдзенай у горных далінах Казахстана. З усёй страснасцю тав. Гершман бярэцца за новую для яго работу. Ён перамагае коснасць і прамое супраціўленне варожага агрэп'я, засеўшага тады ў Наркамземе, і кок-сагіз прышоў на палі Беларусі. Урад Саюза адзначыў заслугі тав. Гершмана і ўзнагародзіў яго медаллю «За трудовую доблесть».

Вясной 1939 года тав. Гершман накіроўваецца дырэктарам Беларускага павільёна на Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ў Маскве. Урадавая камісія пад старшынствам таварыша Молатава прымае павільён з ацэнкай «выдатна». Тав. Гершмана ўзнагароджваюць граматай Галоўвыстаўкома і пачотнай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР.

І вось зараз тав. Гершман прыслан у вызвалены Беласток. Ён працуе сакратаром гарадскога камітэта партыі.

Такі жыццёвы шлях вернага сына вялікай партыі Леніна — Сталіна, большэвіка, для якога няма іншых інтарэсаў, чым інтарэсы партыі, інтарэсы народа.

— Мне зараз 35 год, 20 з іх я аддаў сваёй партыі, ленінска-сталінскаму комсамолу. Я аддам усё сваё жыццё справе Леніна—Сталіна, — гаворыць тав. Гершман.

Выбаршчыкі Старасельскай выбарчай акругі вылучылі тав. Гершмана кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Ён апраўдае іх давер'е.

Т. Лясовіч.

СЯЛЯНЕ З НЕЦЯРПЕННЕМ ЧАКАЮЦЬ ДНЯ ВЫБАРАЎ

(Расказ Еўдакіі Фёдараўны Максімлюк аб сваёй паездцы па выбарчых участках

Мяне вылучылі кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па 349 выбарчай акрузе. Паехала я да выбаршчыкаў участка вёскі Міхалова. На сход прышло 1200 выбаршчыкаў. Стала я расказваць сваю біяграфію. Вядома, многія з сялян ведалі, як я працавала ў абшарнікаў, таму што мела два гектары зямлі і двух дзяцей. Сход аднагалосна пастанавіў, што будзе стопроцантнае галасаванне.

Паехала на іншыя ўчасткі паглядзець, як яны працуюць. Асталася вельмі задаволена. Асабліва спадабалася ў вёсцы Гроднікі, Заблудаўскага раёна. Участак там упрыгожан, зроблены кабіны для галасавання, вывешаны спісы выбаршчыкаў. Выступіла на сходзе многа актыўных удзельнікаў выбарчай работы. Яны сказалі, што галасаванне будзе стопроцантнае. У канцы схода ўзнялі пытанне аб калгасе. Усе ведалі, што ў маёй вёсцы Новая Воля створан калгас імені Сталіна.

Я расказала, як мы арганізавалі калгас. Інвентар, жывы і мёртвы, узялі на ўчот. Назначылі вартаўніка. Калгасных коней паставілі на адпачынак, каб папраўіліся да вясны. Назначылі калгасніка даглядаць за імі. Каровы ў нас пародзістыя, пацяліліся.

Сабрала сход, пастанавілі трох цялят гадаваць. Назначыла двух калгасніц-удсў даіць кароў. Спачатку мы хацелі раздаваць малако бедным калгаснікам. Але атрымалася вялікае непаразуменне. Знайшліся элементы, якія бралі ў нас малако па 50 капеек за літр, а потым прадавалі даражэй. Прышлося гэту практыку прыпыніць.

Склала каляндарны план сяўбы. Сабрала сход і сказала, што прывезлі машыну, якая ачышчае насенне — трыер. Намецілі ачысціць калгаснае насенне.

Пасля таго, як я пабывала ў вёсцы Гроднікі, мяне папрасілі прыехаць у суседнюю вёску. Я не магла адмовіць просьбе сялян, якія паважаюць простую жанчыну, трапіўшую на пачотнае месца.

Адкрылі сход. Я расказала сваю біяграфію. Гавару я не красамоўна, але слухалі мяне ўважліва. Расказала я, што ў Совецкім Саюзе жанчына — роўнапраўная грамадзянка, можа выбіраць і быць выбранай, а ў капіталістычных краінах — у Амерыцы і Францыі — яе пазбаўляюць голасу. Скажу пару слоў — чую апладысменты. Яшчэ больш загрымелі рукаплёсканні, калі я зрабіла вывад, што ні ў адной капіталістычнай краіне не знайшлося чалавека, які заўважыў-бы нас, жанчын. І толькі зараз нас сагрэла яснае сонца — дарагі вызваліцель таварыш Сталін.

Сход стаў пытаць, што такое калгас і соўгас. Як магла, расказала. Была ў мяне яшчэ кніжка — статут сельгасарцелі. Час ужо быў позні, але ўсе сталі прасіць прачытаць. Я прачытала. Тут старшыня сельскага камітэта гаворыць: „Перш чым запісацца ў калгас, падумайце, сяляне". Аказваецца, што ён мае 6 кароў, 4 коней, 25 гектараў зямлі. А тут большасць мае па аднаму гектару.

Я і гавару яму:

— Так, тады табе аб уступленні ў калгас трэба падумаць.

Тут на сходзе ўзнялося хваляванне. Сяляне гавораць — давайце запісвацца ў калгас! Узялі алоўкі і пішуць заявы. А старшыня-кулак паглядзеў заявы і гаворыць: „Так не гадзіцца, тут напісана простым алоўкам". Гляджу, сяляне дасталі хімічны аловак, чарніла, заявы перапісалі.

Тады кулак гаворыць, што, моў, на заявах няма месца для рэзалюцыі і ён такія заявы прыняць не можа. Сяляне бачаць, што кулак над імі здзекваецца, і самі адвезлі ўсе заявы ў Заблудаў.

Такіх сялян аказалася 25. Яны гавораць мне: „Прыедзьце, таварыш, раскажыце нам, як вы арганізавалі калгас. А я-ж сама прыехаць не магу, бо ў мяне 39 участкаў, і ўсюды павінна пабываць. Таму я папрасіла выслаць з Заблудава ў вёскі інструктара.

Цяпер вакол Новай Волі сем калгасаў.

Работа ў маім раёне арганізавана добра, усё падрыхтавана. Сяляне з нецярпеннем чакаюць дня выбараў.

Сустрэча моладзі з кандыдатам

З вялікім уздымам прайшоў сход маладых выбаршчыкаў Гродненскага раёна. Даклад аб задачах моладзі ў выбарчай кампаніі зрабіў сакратар райкома камсамола тав. Маўрын.

На сходзе выступіў кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. В. Лашак.

— Выбаршчыкі нашага раёна, — гаворыць ён, — аказалі мне вялікую чэсць і давер'е, вылучыўшы мяне кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Я завяраю ўсіх прысутных, што з чэсцю апраўдаю гэта вялікае давер'е і прыкладу ўсе свае сілы, каб быць дастойным слугой сваіх выбаршчыкаў.

Комсамолец тав. Смолка (вёска Індура) расказаў, што моладзь раёна з вялікім задавальненнем сустрэла зварот беластоцкіх маладых рабочых. Маладыя выбаршчыкі рыхтуюць дастойныя падарункі маці-радзіме да дня выбараў. Далей тав. Смолка ўнёс прапанову стаць ініцыятарамі пабудовы добрай шасейнай дарогі Гродна—Класоўка, працягам у 11 кіламетраў. Гэта прапанова сустрэла адабрэнне ўсіх прысутных.

У заключэнне сход прыняў рэзалюцыю, у якой гаворыцца:

„Мы абязваемся прыкласці ўсе намаганні да таго, каб у дзень выбараў усе выбаршчыкі, як адзін, прышлі на выбарчыя ўчасткі і аддалі свае галасы за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных".

В. Гарбанёў.

ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ВЫТВОРЧАСЦЬ ТАВАРАЎ ШЫРОКАГА СПАЖЫВАННЯ

XVIII з'езд партыі ўказаў на неабходнасць „усямерна развіваць мясцовую прамысловасць і промкааперацыю, якія з'яўляюцца буйнай крыніцай задаволення растучых патрэбнасцей працоўных".

Разгледзім, наколькі спраўляецца з гэтай задачай прамысловая кааперацыя нашай Беластоцкай вобласці.

Па плану 1940 года арцелі промкааперацыі ў вобласці павінны вырабіць прадукцыі на 41 мільён рублёў, з іх тавараў шырспажыву на 27,5 млн. рублёў. За два месяцы работы ўсімі арцелямі промкааперацыі выпушчана прадукцыі на 2.079.950 рублёў, з якіх тавараў шырспажыву ўсяго на 1.254.154 рублі.

Вынікі яўна нездавальняючыя.

На сёнешні дзень промкааперацыя яшчэ не спраўляецца з сваёй задачай. Гэта адставанне асабліва рэзка адчуваецца ў гарадах Гродна, Ломжы і Валкавыску. Чым можна аб'ясніць, што ў Гродне створана і працуюць толькі пяць арцелей, у Ломжы—тры, а ў Валкавыску ўсяго дзве арцелі, якія вырабляюць тавары шырспажыву? Кіраўніцтва аблпромсаюза недастаткова ўдзяляе ўвагі максімальнаму кааперыраванню саматужнікаў, уцягненню ў промкааперацыю беспрацоўных, адшуканню сыравінных рэсурсаў як для пашырэння існуючай, так і для арганізацыі новых відаў вытворчасці. Асартымент тавараў шырспажыву, вырабляемых арцелямі, яшчэ надзвычайна вузкі, а якасць выпускаемых на рынак тавараў далёка не адпавядае запатрабаванням спажыўца.

Буйным недахопам у рабоце промкааперацыі з'яўляецца тое, што ўсе арцелі працуюць яшчэ без вытворча-фінансавага плана. Сярод членаў арцелей недастаткова арганізавана палітычнае выхаванне і вытворчая вучоба.

Перад прамысловай кааперацыяй вобласці, перад кожнай арцеллю стаіць пачотная і адказная задача: у найкарацейшы час адшукаць магчымасці пашырэння асартымента тавараў шырспажыву, арганізаваць вытворчасць новых відаў тавараў, як ганчарных вырабаў, кандзіцерскіх вырабаў, будаўнічых матэрыялаў. Неабходна пашырыць вытворчасць трыкатажных і рымарных вырабаў, мыла, дэнатурату, газіраваных вод і ахаладжальных напіткаў, вытворчасць і рамонт сельгасінвентару і г. д.

Але было-б памылковым думаць, што гэту адказнейшую справу прамысловая кааперацыя здольна вырашыць самастойна, без дапамогі з боку партыйных і совецкіх арганізацый. Нездавальняючыя вынікі работы промкааперацыі з'явіліся рэзультатам недастатковай увагі, а часта ігнараванне прамысловай кааперацыі з боку асобных гарадскіх і раённых камітэтаў партыі і выканкомаў. Гэта мае месца не толькі ў Гродне, Ломжы, Валкавыску, але і ў Беластоку.

У Беластоку, напрыклад, зусім адсутнічае сетка паправачна-рамонтных майстэрань („амерыканак") па абслугоўванню бытавых патрэб насельніцтва. Гэта вядома і гаркому партыі і горвыканкому. Праўда, яшчэ ў студзені гарком прыняў разгорнутую пастанову, у якой, між іншым, абавязаў горвыканком „прадаставіць неабходную колькасць памяшканняў... для арганізацыі рамонтна-паправачных пунктаў". Але... воз і цяпер там. Уся бяда ў тым, што добрае рашэнне гарком не праверыў, і рэзультат атрымаўся прама адваротны. Па распараджэнню кіраўніка тэкстыльтрэста тав. Карташова промарцель гвалтоўна выганяецца з належачага ёй памяшкання па Надрэчнай вуліцы (№ 5). Горкамгас тры разы прабаваў адміністратыўным парадкам выселіць з займаемага памяшкання шавецкую арцель.

Гарадскія і раённыя камітэты партыі, горвыканкомы павінны дапамагчы арцелям у пастаноўцы палітычна-выхаваўчай работы, арганізацыі соцыялістычнага спаборніцтва, падборы кіруючых кадраў, адпаведных памяшканняў і г. д. Значная роля ў гэтым павінна належаць і комсамолу, паколькі ў прамысловай кааперацыі ўжо сёння працуе каля тысячы чалавек моладзі.

Толькі пры гэтых умовах насельніцтва атрымае неабходныя тавары шырокага спажывання.

В. Скварчэўскі,
інструктар промаддзела абкома КП(б)Б.

МІЖНАРОДНЫ ХАРАКТАР ФІНЛЯНДСКІХ ПАДЗЕЙ

Палкавы камісар А. ГАЛІН

(Працяг. Пачатак у № 51).

У сувязі з гэтым становіцца зразумелым, чаму сярод першых фірм, якія ўнеслі значныя сумы ў фонд дапамогі бела - Фінляндыі, лічацца: федэрацыя лесапрамыслоўцаў (фірмы, якія закупаюць у Фінляндыі лес), Вікерс і звязаныя з ім кампаніі, якія закупаюць нікель, фінансісты бр. Лазар і Берынг, буйная мэблевая фірма Гарыс Лебус, якая вырабляе мэблю з фінляндскіх лесаматэрыялаў, і др. Нарэшце, Танер, як старшыня наглядальнага совета нацыянальнага банка Фінляндыі, і яго дырэктар, белафінскі «прэм'ер» Руці, з'яўляліся прамымі агентамі Англійскага банка, прычым апошні за свае заслугі перад замежным капіталам быў удастоен англійскім каралём звання англійскага дваніна.

Фінансавыя групы ЗША, як, напрыклад, «Браун Бразерс», «Браун Гарымен компані», дапамагалі выпуску фінскіх каштоўных папер, «Нейшэнэл сіці Бэнк» прадаставіў вялікія крэдыты фінскім лесапрамыслоўцам.

Аўтарытэтны амерыканскі даследчык экспарта капітала Льюіс у кнізе «Міжнародныя капіталаўкладанні Амерыкі» ўказвае, што ў руках амерыканцаў мелася ў 1935 годзе на 32 млн. даляраў фінскіх каштоўных папер.

У кнізе «Гаспадары Амерыкі» пісьменнік Росестэр паведамляе, што «Інтэрнейшэнел тэлефон энд тэлеграф компані» (морганаўская) сумесна з шведскай фірмай «Эрыксон» (якая таксама знаходзіцца ў значнай ступені пад кантролем Моргана) забралі ў свае рукі фінскую тэлефонную сетку.

Сенацкая камісія ў ЗША па справах банкаў і валюты адобрыла законапраект аб павелічэнні фондаў Экспартна - імпартнага банка на 100 млн. даляраў. Тым самым Экспартна - імпартны банк атрымлівае магчымасць прадастаўляць пазыку Фінляндыі ў адпаведнасці з прапановай Рузвельта. Справа ідзе аб 20 млн. даляраў, дадаткова да паступіўшых ужо 10 млн. даляраў.

Шведскі запалкавы канцэрн у перыяд панавання Крэйгера меў у Фінляндыі чатыры буйнейшых запалкавых фірмы, якія прадстаўлялі дзве трэці ўсёй прадукцыі краіны. Зне канцэрна стаялі фінляндскія кааператыўныя запалкавыя фабрыкі, якія з 1927 года падначаліліся крэйгераўскаму карцэлю. Банкруцтва канцэрна Крэйгера ўзмацніла групу Валенберга. Яно прывяло толькі да яшчэ большай цэнтралізацыі шведскага капітала ў руках адной групы Валенберга, цесна звязанай з англійскім капіталам.

Шырока вядомы ўсяму свету тэлефонны, тэлеграфны і радыётрэст «М. М. Эрыксон», які ўступае па сваей велічыні толькі амерыканскаму «Інтэрнейшэнел тэлефон энд тэлеграф компані» і германскаму Сіменсу, абслугоўвае ўсю тэлефонную сетку Фінляндыі.

Значны капітал Швецыі ўкладзен і ў акцыянерныя таварыствы нерухомых маёмасцей у Фінляндыі.

У святле гэтых лічб і фактаў становяцца больш зразумелымі гуманітарныя і ідэалістычныя меркаванні англа - франка - амерыканцаў па поваду выдатнай фінскай «дэмакратыі», якая ўвасабляецца катам Манергеймам.

Англа - французы з вялікім незадаволеннем перажылі ўключэнне Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі ў СССР і прасоўванне СССР на Захад. Цяпер яны з жахам думаюць, што будзе, калі ў Фінляндыі замест шайкі Руці — Каяндэра — Танера будзе сапраўдны дэмакратычны ўрад.

Англа - французы з жахам думаюць аб тым, што дагавор аб дружбе і брацтве паміж СССР і Народным урадам Фінляндыі можа адбіцца на даходах замежных капіталістаў, што, зразумела, не выключана. Правы Лойд Джордж, які ў сваім апошнім артыкуле ад 20 лютага пісаў: «Правячыя класы Англіі і Францыі больш зацікаўлены ў вайне супроць большэвіцкай Расіі, чым супроць нацыянал-соцыялісцкай Германіі».

Так выглядае ідэалістычны запал паноў падпальшчыкаў вайны.

АБ ЧЫМ ДУМАЮЦЬ ІМПЕРЫЯЛІСТЫ, КАЛІ ІМ НЕ СПІЦЦА

Аб чым зараз марацъ, на што ставяць стаўку, куды накіроўваюць свае намаганні англійская і французская буржуазія? Яны накіроўваюць усе свае намаганні, і да гэтага заклікана ўся агітацыя і прапаганда, на разрыў адносін паміж СССР і Германіяй. Яны мараць аб тым, каб СССР і Германія пабіліся паміж сабой, каб яны потым маглі рэзаць рамні са спін германскага і рускага народа.

З другога боку, ёсць пэўныя акты, каб сутыкнуць СССР з Японіяй. Вядома, як былі незадаволены ў Англіі, ва Францыі і ў Злучаных Штатах, калі мы прышлі да згоды па раду пытанняў з Японіяй у канцы мінулага года.

Японскія імперыялісты мараць аб тым, каб вайна ў Еўропе вялася бясконца, таму што чым далей будзе цягнуцца вайна ў Еўропе, тым лепш, моў, будзе для Японіі. Вось, напрыклад, што піша ў сувязі з вайной у Еўропе японская газета «Хоці»:

«Узнікненне ваеннай няўрадзіцы ў Еўропе прадстаўляе сабой для Японіі не што іншае, як боскую дапамогу. Аднак нельга думаць, што гэты божаскі вецер будзе дуць вечна. Дзеянні Японіі могуць павялічыць дунавенне гэтага божаскага ветру і могуць зусім спыніць яго».

Гэта-ж газета праз некалькі дзён (28 снежня) піша:

«Гэта вайна з'яўляецца тым ключом, якім будзе адкрыта пачатая намі пабудова новага парадку ва Ўсходняй Азіі. Іменна ў гэтым сэнсе мы і павінны маліцца, каб вайна ператварылася ў зацяжную».

Мы можам толькі сказаць: «Маліся, Емеля, твая нядзеля».

Некаторыя антысовецкія элементы спрабуюць аб'ясніць сваё падтрыманне белафінаў расавымі меркаваннямі. Так, японскае агенцтва Домей Цусін 1 снежня 1939 г. пісала:

«Вялікая ўвага японскага народа да фінаў аб'ясняецца тым, што апошнія па свайму расаваму і моўнаму паходжанню родственны японскаму народу».

У той-жа час орган італьянскага міністра замежных спраў Чыано «Тэлеграф» даказваў нядаўна, што Фінляндыя прадстаўляе сабою «найбольш старадаўні цэнтр паўночна-германскай расы».

Мы супроць гэтых «родственных» выказванняў не супярэчым, але вельмі характэрна, што ўсе гэтыя родственныя тлумачэнні прыўрочаны нсяк да апошніх падзей, калі аказалася, што бела-Фінляндыя, размешчаная ля сэрца Совецкага Саюза—Ленінграда, рыхтавала пры дапамозе сваіх апекуноў удар супроць нашай соцыялістычнай айчыны.

ЖАРАНЫЯ ГАЗЕТНЫЯ КАЧКІ, ЦІ БРЭХАЗАЎРЫ ЗА РАБОТАЙ

Вось ужо амаль тры месяцы, як міжнародная прэса разгарнула шалёную кампанію хлусні і паклёпаў супроць СССР.

Цяжка сабе нават уявіць, да якіх граніц даходзіць беспардонная хлусня па адрасу Совецкага Саюза.

Да чаго дакатваецца растленная фантазія журналістаў, якія прадаюцца агулам і ў розніцу, відаць з наступных некалькіх не абвергнутых ТАСС (на ўсякую хлусню не начыхаешся!) газетных качак, выведзеных у рэдакцыйным інкубатары жоўтай прэсы.

Гавас ад 4 студзеня перадае: «У Расіі наглядаецца сільнае прабуджэнне містыкі. Салдаты, перш чым ісці ў бой, хрысціліся».

Агенцтва Гавас 24 студзеня перадала наступнае паведамленне з Хельсінкі: «Фінскі пілот Перма Сарванто ў якіх-небудзь 4 мінуты знішчыў 6 рускіх самалётаў». Тое-ж агенцтва 24 студзеня хлусіць: «Рускія бамбардыруюць шпіталі, пасты першай дапамогі і іншыя аб'екты, адзначаныя чырвоным крыжам».

У газеце «Венцьем сьекль» 24 студзеня на першай старонцы быў змешчан велізарны загаловак наступнага зместу: «У часе рэйдаў фінскіх самалётаў над Кранштадтам многа совецкіх крэйсераў было сур'ёзна пашкоджана». Пад гэтым загалоўкам ішло паведамленне агенцтва Гавас, ад 23 студзеня з Хельсінкі, Але ў гэтай-жа газеце на шостай старонцы быў і другі загаловак: «Фінская авіяцыя не бамбардыравала Кранштадт».

Фотаздымак, на якім паказаны маці і дачка, якія аплакваюць страту сваёй маёмасці пасля пажару ў бруклінскім доме-казарме, упершыню быў надрукаван на Кубе. Калі ў Амерыцы пачалася кампанія вакол фінляндскіх «жахаў», гэты фотаздымак быў адноўлен у амерыканскай газеце «Спрынгфільд уніон». «Дэйлі уоркер» патрабавала абвяржэння, але рэдактар газеты адказаў, што ён не зацікаўлен у аднаўленні ісціны, і дадаў: «Мы не можам прызнаць, што апублікаванне намі з'яўляецца фальшыўкай, бо такіх фальшывак мільёны».

Газеты «Афтонбладэт», «Стокгольмс Тыднінген» і др. змясцілі фотаздымак з наступным надпісам: «Трое вясёлых рускіх палонных, якія атрымліваюць першы абед у фінаў пасля таго, як яны былі спачатку прыведзены ў парадак».

Гэты-ж фотаздымак другія газеты «Гетэборгс Тыднінген», «Свенска Дагбладэт» і др, змясцілі з зусім іншым подпісам: «Фінскія афіцэры гутараць у часе выпадковага снедання».

Можна было-б прывесці яшчэ сотні прыкладаў такіх-жа «верагодных звестак», уключаючы, напрыклад, і такія звесткі, як пасылка на фінляндскі фронт прывыкшых да суровага холаду узбекаў і таджыкаў і заявы аб шматлікіх беспарадках у СССР і т. д.

Сапраўды правы быў адзін з арганізатараў рэспубліканскай партыі ЗША, які заявіў у часе выбараў: «Дайце мне дастатковую колькасць даляраў і я вам ператвару рыжага пса ў апостала Паўла».

ДВА ЎРАДЫ ФІНЛЯНДЫІ

Гісторыя ведае многа прыкладаў двоеўладства.

Самы апошні вядомы нам прыклад— гэта грамадзянская вайна і двоеўладства ў Іспаніі, калі генерал Франко пры дапамозе другіх імперыялістычных дзяржаў (Англіі, Францыі, Італіі і др.) паўстаў супроць законнага дэмакратычнага ўрада ў Іспаніі. Тое, што адбываецца ў Фінляндыі, падобна на падзеі ў Іспаніі, але з адваротным знакам. У Фінляндыі ва ўладзе стаіць поўбандыцкі, белагвардзейскі ўрад, супроць якога паўстаў народ, які вядзе вызваленчую барацьбу пры падтрыманні Совецкага Саюза.

Па тыпу свайму і характару Народны ўрад Фінляндыі набліжаецца да ўрада народнага фронта Іспаніі. Ўрад Негрына і ўрад Куусінена — гэта сапраўды народная дэмакратычная ўлада. У Іспаніі і Фінляндыі былі створаны рэспублікі не на аснове фармальнай дэмакратыі, а на аснове канфіскацыі буйнага землеўладання ў карысць сялян і ўстанаўлення дзяржаўнага кантролю над буйнымі прыватнымі банкамі і прамысловымі прадпрыемствамі.

Гэта абстаноўка двоеўладства накладвае асаблівы адбітак на ўсе падзеі, якія адбыліся ў самой Філяндыі і за яе межамі, бо ўрад, які ўзначальвае Куусінен, гэта — урад, які вышаў з народа, урад, які гатовы арганізаваць усё жыццё Фінляндыі для народа і ў інтарэсах народа. Адсюль — шаленства міжнароднага капітала і вар'яцкія выхадкі фінскіх белагвардзейцаў.

Якая-ж унутраная палітыка белафінскага ўрада? Ён зганяе з наседжаных месц сотні тысяч рабочых, сялян, а калі насельніцтва адмаўляецца ўходзіць са сваіх дамоў, шуцкораўцы падпальваюць дамы і расстрэльваюць пратэстуючых.

Пакідаючы пад напорам совецкіх войск свае пазіцыі, белагвардзейцы падпальваюць заводы, фабрыкі, ламаюць машыны, знішчаюць таварных запасы для таго, каб працоўным Фінляндыі нічога не асталося! У бела-Фінляндыі пануе зусім нечуваны тэрор, сотні людзей расстрэльваюцца без суда і следства. За малейшае незадаволенне—расстрэл, прычым матывіроўка прыгавора адна і тая-ж: за шпіянаж на карысць замежнай дзяржавы. Пад гэту рубрыку падходзяць людзі, якія спачуваюць Народнаму ўраду Фінляндыі, людзі, якія не жадаюць пакінуць наседжаныя месцы, людзі, якія выказваюцца супроць белагвардзейскага рэжыму, якія сумняваюцца ў дэмакратычных добрых якасцях манергеймаў і іншых герояў капіталістычнага свету. Для ўсіх незадаволеных ёсць толькі адзін адказ—расстрэл.

Даныя, з трудом пранікшыя ў замежны друк, сведчаць аб вялікай незадаволенасці ў Фінляндыі. Гэта незадаволенасць ахваціла нават і армію. Звесткі аб гэтым пранікаюць нават у буржуазныя газеты. Шведская і нарвежская прэса піша: «Нядаўна было расстрэлена 60 салдат за шпіянаж».

Для характарыстыкі ідэалагічных настрояў фінскага белагвардзейскага афіцэрства дастаткова прывесці наступны прыклад: у палоннага фінскага афіцэра была адабрана запісная кніжка, у якой знайшлі запіс канспекта заняткаў з салдатамі па палітграмаце, Вось што там запісана; «Каго лічыць парушальнікамі фінляндскай граніцы?» І тут-жа рукой афіцэра напісан адказ: «Парушальнікамі граніцы з'яўляюцца агенты фінскай компартыі, беспрацоўныя і бяздомныя».

Што прадстаўляе сабою Народны ўрад і ці мае ён апору ў краіне?

Пасля падаўлення рэволюцыі 1918 года комуністы некалькі разоў атрымлівалі пераважную большасць у прафсаюзах Фінляндыі, але кожны раз паліцыя закрывала прафсаюзы, а соцыял-дэмакраты зараз-жа стваралі свае прафарганізацыі, куды не пускалі рэволюцыйных рабочых. Турмы сістэматычна запаўняліся комуністамі і левымі рабочымі і, такім чынам забяспечвалася панаванне ў рабочым класе фінляндскай соцыял-дэмакратыі.

Ні на адзін момант не спыняліся рэпрэсіі супроць фінскай компартыі і левых рабочых. Жорсткія прыгаворы сыпаліся на фінскіх пролетарыяў, турмы аказаліся перапоўненымі. З дапамогаю пытак і правакацый паліцыі і шуцкораўцам удалося вылавіць пэўную колькасць рэволюцыйных рабочых яшчэ да пачатку цяперашніх падзей.

Напярэдадні падзей компартыя Фінляндыі налічвала ў глыбокім падполлі каля 1.000 чалавек. Нам, прывыкшым да мільённай партыі, гэтая лічба можа здацца маленькай. Але такія рэчы рашаюцца не ў абсалютных, а ў адносных цыфрах. Напярэдадні Лютаўскай рэволюцыі большэвіцкая партыя налічвала каля 10.000 чалавек, што азначае 1 член партыі на 15.000 душ насельніцтва, а ў Фінляндыі, напярэдадні апошніх падзей, быў 1 комуніст на 3.800 душ насельніцтва. Гэта значыць, што компартыя мае найглыбейшыя корні ў краіне.

Аб тым, наколькі компартыя звязана з народам, сведчаць матэрыялы, якія друкуюцца ў газеце «Советская Карелия», і газеце, якая выдаецца дэмакратычным урадам Фінляндыі пад назвай «Народная ўлада». На бок Народнага ўрада пераходзяць адзіночкі і нават групы салдат з белай арміі. Уцалеўшае насельніцтва гарадоў і вёсак сустракае 1-шы фінскі корпус і совецкія войскі, як вызваліцеляў.

З гэтых нямногіх фактаў відаць, на каго і на што апіраецца ўрад Манергейма-Танера і на каго апіраецца ўрад Куусінена. Зараз ужо раздаюцца за рубяжом галасы аб прымірэнні старон, аб тым, што ўрад Руці—Танера гатоў прыняць прапановы Совецкага ўрада і інш. Усякай гаротніне свой час. Што-ж датычыцца Свінхувуда, то наўрад ці захоча фінскі народ мяняць шыла на швайку. Ён і без Свін... хувуда абыйдзецца.

Адно ясна, што грамадзянская вайна ў Фінляндыі ніяк не можа скончыцца так, як гэтага хацелася-б гаспадарам і апекунам Манергейма. Манергейму адзін раз ужо ўдалося пры дапамозе замежных войск раздавіць рабочую рэволюцыю. Тады Совецкая Расія была занадта слабая, каб выканаць свой доўг у адносінах да брацкага фінскага народа. Цяпер часы змяніліся, і пераможа, ці хочуць гэтага ў Лондане, Парыжы і Вашынгтоне ці не, народная дэмакратычная ўлада.

МІЖНАРОДНЫ ПРОЛЕТАРЫЯТ І ГРАМАДЗЯНСКАЯ ВАЙНА Ў ФІНЛЯНДЫІ

Пад прамую дыктоўку англійскага, французскага, амерыканскага, шведскага і нарвежскага ўрадаў пачалася шалёная кампанія ў карысць белафінаў, прычым гэта не толькі кампанія маральнай дапамогі, але таксама ваеннага і матэрыяльнага садзейнічання. За два месяцы, паколькі можна меркаваць па газетах, бела-Фінляндыя атрымала велізарную дапамогу дабравольцамі, зброяй, зборамі і пазыкамі.

У кампаніі па збору грошай звяртае на сябе ўвагу асобая лакейская стараннасць правадыроў міжнароднай соцыял-дэмакратыі і рэфармісцкіх прафсаюзаў. Кіраўнікі Амстэрдамскага інтэрнацыянала і прафсаюзныя лідэры Англіі, ЗША, Швецыі, Нарвегіі, Галандыі, Швейцарыі, Бельгіі, Францыі, не пытаючы рабочых, асігнавалі адносна вялікія сумы грошай белафінам, што не магло не выклікаць рэзкага пратэсту з боку членскай масы, Тыя самыя «рабочыя» правадыры, якія так неахвотна дапамагалі гераічнаму іспанскаму народу ў яго барацьбе за сваю незалежнасць, са скуры лезуць вон, каб выслужыцца перад сваёй буржуазіяй.

Гэта дапамога носіць настолькі ярка выражаны класавы характар, што чэсныя рабочыя ва ўсіх краінах, асабліва ў Англіі, Швецыі, Нарвегіі і Даніі, паднялі буру пратэсту супроць траты народных грошай і рабочых зберажэнняў на банду Манергейм—Руці—Танер.



На здымку: Удзельнік баёў з белафінамі — Герой Совецкага Саюза малодшы лейтэнант П. В, Усаў.
(Фота-клішэ ТАСС).



На здымку: Удзельнік баёў з белафінамі — малодшы лейтэнант І. І. Сапрыкін, узнагароджаны ордэнам Леніна. (Фота-клішэ ТАСС).

Гэтыя пратэсты прымаюць тым больш рэзкі характар, што рабочыя на практыцы пераконваюцца ў тым, што клопаты аб фінскіх белагвардзейцах ідуць паралельна з поўным ігнараваннем элементарных інтарэсаў і патрэб працоўных мас у кожнай краіне.

У міжнародным рабочым руху ў сувязі з падзеямі ў Фінляндыі адбылася рэзкая дыферэнцыяцыя. Калі верыць буржуазным соцыял-дэмакратычным газетам, то можа атрымацца такое ўражанне, што пераважная большасць рабочага класа за бела-Фінляндыю. Чаму атрымліваецца такое ўражанне?

Кіраўнікі II Інтэрнацыянала рэзка асудзілі СССР, урад Куусінена і выказаліся за «дэмакратыю» Манергейма—Руці—Танера. Сітрын, Жуо і іншыя не ўпускаюць выпадку, каб прадэманстраваць свае гарачыя сімпатыі да катаў фінскага народа і выказаць сваё асуджэнне Совецкаму Саюзу. Лідэры соцыял-дэмакратычных партый—французскай, англійскай, бельгійскай, шведскай, нарвежскай, дацкай, галандскай, швейцарскай, амерыканскай і нават германскай і т. д.— аднадушна выступаюць у гэтым-жа духу, усяляк распісваючы прыгожасці фінскай «дэмакратыі».

Кожнае слова, сказанае гэтымі панамі, кожная рэзалюцыя II і Амстэрдамскага Інтэрнацыяналаў падхватваюцца ўсім міжнародным друкам, распісваюцца на ўсе лады для таго, каб стварыць уражанне, што міжнародны пролетарыят—з бела-Фінляндыяй і супроць Совецкага Саюза.

Але кіраўнікі II і Амстэрдамскага Інтэрнацыяналаў, вярхушка соцыялдэмакратычных партый—гэта далёка не пролетарыят. Гэта—людзі, якія на жыццё і на смерць звязаны з капіталістычнай эксплаатацыяй, гэта—людзі, якія маюць вельмі аддаленыя, прама астранамічныя адносіны да соцыялізма. Гаварыць з гільфердынгамі, блюмамі аб соцыялізме—гэта ўсёроўна, што тэлеграфнаму слупу воспу прывіваць.

Зразумела, гэта разнузданая антысовецкая агітацыя і прапаганда, у якой прымаюць удзел правадыры міжнароднай соцыял-дэмакратыі, і ўнушаемая працоўным штодзённа і настойліва ўсёй сусветнай прэсай мысль аб тым, што Совецкі Саюз вядзе імперыялістычную палітыку, пакідаюць пэўны след у сазнанні некаторай часткі працоўных. Але ўсё-ж аб'яднаным сілам буржуазнай соцыял-дэмакратыі ніяк не ўдаецца перакапаць асноўныя масы міжнароднага пролетарыята ў тым, што бела-Фінляндыя—гэта краіна «разгорнутай дэмакратыі», а СССР робіць замах на незалежнасць фінскага народа.

Якія ёсць падставы для таго, каб меркаваць аб сапраўдных настроях рабочых мас?

Не гледзячы на жорсткія праследванні компартыі, забарону комуністычнага друку ва Францыі, Бельгіі і ў другіх краінах, у масы па тысячах каналаў пранікаюць звесткі, што з бела-Фінляндыяй і соцыял-дэмакратыяй нядобра.

Там, дзе захаваліся рэшткі дэмакратыі і выходзяць комуністычныя газеты (у Швецыі, Нарвегіі, Даніі), на іх старонках з'яўляюцца карэспандэнцыі, якія адлюстроўваюць нянавісць рабочых да белафінляндскага рэжыма і сімпатыі ў адносінах да Народнага ўрада.

У тых краінах, дзе ёсць мінімальныя свабоды для работы компартыі, як, напрыклад, у Англіі, компартыі хутка растуць, заваёўваюць новыя групы рабочых. Не выпадкова Сітрын ставіць пытанне аб роспуску англійскай компартыі.

Трэба сказаць, што адносіны рабочых да двух змагаючыхся ў Фінляндыі ўрадаў знаходзяцца ў прамой залежнасці ад усёй ваеннай абстаноўкі. На самай справе, што адбываецца зараз у ваюючых краінах?

Сістэматычнае пагоршанне эканамічнага і прававога становішча рабочага класа: велізарны рост падаткаў, які ўсім сваім цяжарам абрушваецца на працоўных: усе ваенныя мерапрыемствы—прымусовае высяленне, перасяленне, абмежаванне спажывання прадметаў першай неабходнасці і іншае—абрушваюцца, зразумела, толькі на працоўных і не закранаюць пануючыя класы. Ва ўсіх краінах—Англіі, Францыі, Злучаных Штатах, скандынаўскіх краінах—адзначаецца велізарны рост цэн, змяншаецца зарплата; удзел соцыялістаў у праследванні комуністаў, компартыі і рэволюцыйных рабочых, супадзенне праследвання компартыі з пагоршаннем становішча рабочых мас кідаюцца ў вочы радавым рабочым. Адсюль—узрастаючая нянавісць да вайны і пошукі выхаду.

Не выпадкова англійскія і французскія профбюракраты збіраюцца разам для адурачвання рабочых. На сваім апошнім пасяджэнні 25 студзеня яны з непакоем канстатыравалі, што прапаганда комуністаў можа «адмоўна сказацца на салідарнасці рабочага руху Англіі і Францыі».

Гэта туманная фраза сведчыць аб тым, што рух супроць рэакцыі прымае грозныя размеры. Аб гэтым сведчаць таксама трывожныя ноткі ў апошняй прамове Далад'е і яўная стомленасць салдат.

ШТО-Ж ДАЛЕЙ?

Не маючы магчымасці атрымліваць перамогі на знешнім фронце, англічане, і асабліва французы, атрымліваюць «перамогі» на ўнутраным фронце. Ва Францыі забаронена комуністычная партыя, закрыты ўсе газеты, канфіскавана партыйная маёмасць, усе комуністы выключаны з парламента, тысячы людзей арыштаваны; у канцлагеры пасаджаны ўсе эмігранты, якія шукалі прытулку ва Францыі; з бібліятэк ізымаюцца кнігі Горкага. Духоўная рэакцыя і жывёльны страх перад рабочым рухам—вось першы рэзультат «вызваленчай» вайны,

Рэакцыя падняла галаву таксама і ў ЗША, дзе Рузвельт адмовіўся ад усіх сваіх прагрэсіўных рэформ і пайшоў на паклон да шалёных рэакцыянераў. Фашысты тыпу Дайса і Фіша арганізуюць траўлю комуністаў і СССР. Сакратар компартыі Браудэр прыгаворан да турэмнага зняволення за тое, што ён нібыта карыстаўся фальшывым пашпартам на сваё ўласнае імя.

Ад буржуазнай дэмакратыі астаецца ўсё менш і менш. Такі першы рэзультат «вызваленчай» вайны. Такавы дзеянні «барацьбітоў за прагрэс і дэмакратыю».

Чым тлумачыцца гэта рэакцыйнае шаленства? Тым, што рабочы клас не хоча ваяваць і не хоча праліваць сваю кроў за калоніі, за ўтрыманне пануючага становішча Англіі. Ён не хоча ваяваць за тое, каб сотні мільёнаў людзей ва французскіх і англійскіх калоніях і далей былі рабамі парыжскай і лонданскай бірж.

Часовыя гаспадары жыцця ведаюць сімпатыі эксплаатацарскіх мас да Совецкага Саюза. Яны з жахам думаюць, што будзе, калі ў аслабленай Еўропе будзе прадаўжаць існаваць і расці неаслабленае соцыялістычнае грамадства. Вось надзвычай характэрныя выказванні вялікай рэакцыйнай бельгійскай газеты па гэтаму пытанню, Газета «Лібр Бельжык» ад 24 студзеня апублікавала артыкул свайго парыжскага карэспандэнта, у якім указваецца, што ва Францыі разгортваецца гарачая палеміка паміж староннікамі і праціўнікамі разрыву дыпламатычных адносін з СССР. Спрэчкі ідуць вакол пытання:

«Ці трэба лічыць СССР ворагам нумар першы пасля Германіі, ці лічыць яго так-жа небяспечным, як і Германію?»

Паведаміўшы аб гэтай барацьбе розных тэндэнцый у Парыжы, карэспандэнт заўважае: «Але ва Францыі забываюць яшчэ адно пытанне—гэта лёс Еўропы. Што будзе, калі СССР астанецца па-за канфліктам і абмяжуецца толькі адным фінляндскім інцыдэнтам?»—«Пасля вайны 1914 — 1918 гг. мы бачылі рух рэволюцыйных сіл у Італіі, Аўстрыі, Германіі і т. д.».—«Калі яны тады былі вадушаны Носке, Зейпелем, Джыоліцці, калі яны тады былі ліквідаваны, то што-ж будзе цяпер, пры наяўнасці такога рэволюцыйнага цэнтра, як СССР?

Што-ж тады будзе з Еўропай у канцы вайны, калі галоўныя ваюючыя краіны будуць абяссілены вайной, калі ўнутры іх створацца спрыяючыя ўмовы для рэволюцыі?».

«Праблема міра, — гаворыць у заключэнне карэспандэнт, — не можа быць вырашана без папярэдняй нейтралізацыі гэтай сатанінскай сілы, якая чакае толькі выпадку, каб знішчыць еўрапейскую цывілізацыю».

Ісціна гаворыць не толькі вуснамі младзенцаў, але часам і вуснамі баючыхся рэволюцыі і ўслужаючых буржуазіі пісак. Цяпер зразумела, чаму хочуць ва што-б то ні стала ўцягнуць СССР у вайну, цяпер зразумелы ўсе махінацыі нашых ворагаў, Напалоханы да смерці журналіст выбаўтаў сакрэтныя думы эксплаататараў усіх краін.

1 сакавіка 1918 г. Совет Народных Камісараў РСФСР і Совет Упаўнаважаных Фінляндскай Соцыялістычнай Рабочай Рэспублікі заключылі дагавор «для ўмацавання дружбы і брацтва паміж памянёнымі свабоднымі Рэспублікамі». Гэты брацкі дагавор, разарваны разгромам фінскай рабочай рэволюцыі 1918 г., цяпер адрадзіўся ў Дагаворы аб узаемадапамозе і дружбе паміж Совецкім Саюзам і Фінляндскай Дэмакратычнай Рэспублікай ад 2 снежня 1939 года. Няма ў свеце такой сілы, якая магла-б разарваць гэты моцны, як хуткарэжучая сталь, дагавор паміж брацкімі народамі. Часы не тыя!

Няхай буржуазія ўмацоўваецца на лініях Мажыно — Манергейма і інш. Мы маем свае ўласныя высокаякасныя тэхнічныя сродкі для абароны нашай радзімы. Але, акрамя тэхнічных сродкаў, мы маем сваю лінію — лінію Леніна — Сталіна, на якой мы моцна стаім і якая прывядзе нас да перамогі комунізма ва ўсім свеце.

ТЭЛЕГРАМЫ

ВЫМУШАНЫЯ ПРЫЗНАННІ АНГЛІЙСКАГА ЖУРНАЛІСТА

Пераможнае прасоўванне Чырвонай Арміі на Карэльскім перашыйку выклікала замяшанне ў радах прадажнага буржуазнага англійскага друку. Яркім прыкладам гэтага з'яўляецца заява палітычнага аглядальніка кансерватыўнага журнала „Трус". У нумары ад 16 лютага аглядальнік гэтага журнала запытвае: па якой прычыне англійскі ўрад адмовіў дазволіць выезд з Англіі ў Фінляндыю і СССР карэспандэнтам газеты „Дэйлі уоркер" Фрэнку Піткэрну і Айвору Монтэгю?

„Я, — піша аглядальнік, — задаю гэта пытанне не таму, што я маю якія-небудзь сімпатыі альбо павагу да органа комуністычнай партыі ці непасрэдна да Піткэрна і Монтэгю. Падобныя меры супроць гэтых двух журналістаў і асабліва супроць Піткэрна параджаюць ва мне сумненні адносна праўдзівасці паведамленняў, якія мы атрымліваем аб ваенных дзеяннях у Фінляндыі, ці вярней павялічваюць мае сумненні адносна сапраўднасці гэтых паведамленняў. Калі-б нам гаварылі праўду, дык што-б напісаў Піткэрн і Монтэгю, гэта не магло прычыніць якой-небудзь шкоды".

„Што датычыцца мяне, — заяўляе далей аглядальнік, — то я ніколі не даверыў казкам аб велізарных стратах рускіх і паражэннях, якія яны нібыта церпяць. Калі-б гэтыя паведамленні адпавядалі сапраўднасці, тады ўзнікае пытанне, якім чынам Чырвоная Армія магла-б зараз наносіць сакрушальныя ўдары на лініі Манергейма?".

(ТАСС).

БАРАЦЬБА АНГЛІЙСКІХ РАБОЧЫХ СУПРОЦЬ ВАЙНЫ

Лондан, 3 сакавіка (ТАСС). Адной з форм барацьбы супроць цяперашняга англійскага ўрада і яго палітыкі вайны з'яўляецца выстаўленне рабочымі арганізацыямі на дадатковых парламенцкіх выбарах антываенных кандыдатаў. Як вядома, лідэры лейбарысцкай партыі, якія заключылі з кансерватарамі дагавор аб „палітычным міры" на час вайны, усяляк перашкаджаюць выстаўленню антываенных кандыдатур на надыходзячых парламенцкіх выбарах. Такім чынам ужо сам факт выстаўлення такога кандыдата мясцовымі лейбарысцкімі арганізацыямі сведчыць аб вялікім нездаволенні сярод радавых членаў лейбарысцкай партыі і прафсаюзаў прадажнай палітыкай прадажнай вярхушкі лейбарысцкай партыі і генсовета трэд-юніёнаў.

У бліжэйшы час у Кетэрынгу (графства Нертгемптон) павінны адбыцца дадатковыя парламенцкія выбары. Не глядзячы на процідзеянне выканкома лейбарысцкай партыі, мясцовыя арганізацыі лейбарыстаў і трэд-юніёнаў выставілі супроць кансерватыўнага кандыдата кандыдатуру Роса, які выступае з праграмай спынення вайны.

Надзвычайна паказальна, што кандыдатуру антываеннага кандыдата ў Кетэрынгу падтрымліваюць многія дзеячы мясцовых лейбарысцкай і прафсаюзных арганізацый.

Барацьба нарвежскіх рабочых супроць вайны

Осло, 3 сакавіка (ТАСС).

Днямі адбыўся агульны сход членаў саюза электраманцёраў горада Бергена (Нарвегія). Бергенскія рабочыя катэгарычна адмовіліся аказваць дапамогу балафінам і патрабавалі, каб нарвежскі ўрад захоўваў строгі нейтралітэт. Сход выразіў пратэст супроць прымусовай адпраўкі фінскіх бежанцаў у бела-Фінляндыю. Прыстутныя патрабавалі таксама, каб нарвежскі ўрад прыпыніў дзейнасць агентаў англа-французскага блока, якая накіравана на ўцягненне Нарвегіі ў вайну.

Рэакцыйнае кіраўніцтва бергенскай арганізацыі соцыял-дэмакратычнай партыі ўчыніла расправу над буйнейшай прафарганізацыяй. Як паведамляе нарвежская газета „Афтэнпостэн", яно „рашыла выключыць з партыі ўсіх членаў саюза электраманцёраў горада Бергена". „Лідэры" нарвежскай соцыял-дэмакратыі яшчэ раз прадэманстравалі, што яны дзейнічаюць разам з фінскай белагвардзейшчынай.

Дэманстрацыя беспрацоўных у Калумбіі

Нью-Йорк, 2 сакавіка.

Газета „Дэйлі уоркер" паведамляе з Баготы (Калумбія), што беспрацоўныя, якія сабраліся з усіх канцоў краіны, зрабілі там дэманстрацыю, патрабуючы работы і хлеба. Калі міністр працы Кастыльо выступіў з нападкамі на Савецкі Саюз, беспрацоўныя перарвалі яго прамову воклічамі: „Няхай жыве Савецкі Саюз! Далоў Манергейма!".

(ТАСС)

ГЕРМАНА-ІТАЛЬЯНСКАЕ ГАНДЛЁВАЕ ПАГАДНЕННЕ

Германскі друк паведамляе аб тым, што некалькі дзён таму назад у Рыме адбылося пасяджэнне германа-італьянскай камісіі, на якім было дасягнута пагадненне аб тавараабароце паміж абодвума краінамі на 1940 год. Новае гандлёвае пагадненне паміж Італіяй і Германіяй прадугледжвае пашырэнне ўжо існуючых пагадненняў. Газета „Фелькішэр беобахтэр" падкрэслівае, што пасля таго, як спроба англа-французскіх падпальшчыкаў вайны перашкодзіць нармальным гаспадарчым адносінам Германіі з Савецкім Саюзам не ўдалася, лонданскія і парыжскія банкіры прабавалі перашкодзіць германа-італьянскім перагаворам, але і гэта ім не ўдалося.

(ТАСС).

Германа-нарвежскія адносіны

Осло, 2 сакавіка. (ТАСС) Нарвежскае тэлеграфнае агенцтва перадае, што днямі старшыня парламента Хамбро звярнуўся да ўрада з пытаннем, якія былі прадпрыняты меры для прадухілення гібелі соцень нарвежцаў і многіх суднаў у выніку марской вайны. Хамбро ўпамянуў аб патапленні нарвежскіх суднаў германскімі падводнымі лодкамі, а таксама заявіў, што мінная вайна парушае міжнароднае права. Адказваючы Хамбро, міністр замежных спраў Кут заявіў, што нарвежскі гандлёвы флот страціў 50 суднаў і 350 маракоў. Кут указаў, што Нарвегія, Данія і Швецыя прадпрымуць дэмарш перад урадамі ваюючых краін і патрэбуюць ад іх спынення незаконнага вядзення міннай вайны. У сваёй прамове Кут выступаў як супроць англійскага кантролю „кантрабандных тавараў", так і супроць апошняй германскай перасцярогі, згодна якой Германія будзе тапіць судны, што заходзяць у англійскія кантрольныя пункты.

Берлін, 2 сакавіка. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што ў германскіх палітычных кругах лічаць заяву Кута аб міннай вайне незразумелай, паколькі „ўжыванне мін Германіяй праводзіцца пры строгім захаванні міжнароднага права". Таксама нечаканай, гаворыцца ў паведамленні, з'яўляецца заява Кута адносна германскай перасцярогі". Калі нейтральныя дзяржавы, — заяўляюць у германскіх палітычных кругах, —на жаль, не маюць мужнасці выступіць супроць парушэння Англіяй міжнароднага права і тым самым абараніць свой нейтралітэт, то нельга на гэтай падставе патрабаваць, каб Германія пакарылася ў барацьбе з Англіяй".

КАРНАЯ ЭКСПЕДЫЦЫЯ АНГЛІЧАН У ВАЗІРЫСТАНЕ

Кабул, 3 сакавіка. (ТАСС). Па паведамленню індыйскай газеты «Сівіл энд мілітэры газет», англійская карная экспедыцыя адкрыла ваенныя дзеянні супроць горных плямён Вазірыстана. 21 лютага войскі павялі наступленне супроць племя ахмедзаяў, насяляючага паўднёвую частку Вазірыстана. Гэта племя аказвае войскам моцнае супраціўленне.

Другая калона ў саставе двух пенджабскіх і аднаго белуджыстанскага пяхотных палкоў пры падтрыманні артылерыі вядзе наступленне з Банну. З прычыны моцнага супраціўлення паўстанцаў калона не змагла прасунуцца наперад.

Перад карнай экспедыцыяй пастаўлена задача ўстанавіць сувязь паміж гарадамі Банну і Кохатам. У гэтым раёне аб'яўлена ваеннае становішча.

Індыйская мусульманская ліга прыняла рэзалюцыю пратэсту супроць дзеянняў карнай экспедыцыі ў Вазірыстане. У рэзалюцыі ўказваецца, што плямёны паўсталі, не выцерпеўшы ўціску англійскіх каланізатараў.

НОВЫЯ НАДЗВЫЧАЙНЫЯ ЗАКОНЫ ВА ФРАНЦЫІ

Парыж, 3 сакавіка.

Учора ва французскім урадавым органе „Журналь афісіель" было надрукавана 22 новых надзвычайных дэкрэты, якія яшчэ больш пагаршаюць становішча працоўных. Па афіцыяльных растлумачэннях, гэтыя дэкрэты прызначаны абмежаваць спажыванне. Згодна з дэкрэтам кожны жыхар Францыі павінен да 1 красавіка падаць заяву на атрыманне прадуктовай карткі. Дазваляецца выпякаць і прадаваць толькі звычайныя сарты хлеба. Кандзіцерскія і ўсе падобныя прадпрыемствы павінны быць зачынены тры дні ў тыдзень. У рэстаранах забаронена падаваць наведвальніку больш двух страў, пры чым толькі адна з іх можа быць мясная.

Абмяжоўваецца таксама спажыванне гаручага, устанаўліваецца месячная норма спажывання гаручага. Тры дні ў тыдзень забаронен продаж спіртных напіткаў. На ўвесь час вядзення вайны ўводзіцца абавязковае выкарыстанне жаночай работы ў некаторых прафесіях. На працягу двухмесячнага тэрміну будзе праведзен добраахвотны набор жаночай сілы, але калі патрэбнасць у жаночай працы перавысіць добраахвотныя прапановы, тады жанчыны будуць прыцягвацца на работы ў прымусовым парадку.

(ТАСС).



На здымку: Выдатны спартсмен-стралок Ліза Дукор — вучаніца 10 класа 47-й Мінскай сярэдняй школы. Яна мае чатыры абаронных значкі і ўзнагароджана чатырма жэтонамі за гарадское першынства па гімнастыцы і лыжах. (Фотахроніка БЕЛТА).

ПА ГОРАДУ І ВОБЛАСЦІ

СКОРАСНАЕ БУДАЎНІЦТВА ДАРОГ

Па ініцыятыве сялян у гэтым годзе ў Беластоцкай вобласці скорасным метадам будзе пабудавана 166,5 кілометра дарог. Работы пачаліся ўжо на дарогах Аўгустоў — Бельск і Ваўкавыск — Рось.

За апошнія два месяцы для будаўніцтва гэтых дарог загатоўлена ўжо звыш 3500 кубаметраў каменя, каля 1500 кубаметраў гравію, і 6000 кубаметраў лесу.

АДКРЫЦЦЕ СТУДЫІ ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА

У Доме народнай творчасці адкрылася студыя выяўленчага мастацтва для таленавітай моладзі.

У гэтай студыі займаецца цяпер 30 чалавек. Перад паступленнем у яе вучні прайшлі двухмесячныя падрыхтоўчыя курсы.

Праграма заняткаў у студыі разлічана на тры гады. У сучасны момант калектыў студыі дзейна рыхтуецца да абласной мастацкай выстаўкі.

ДА ГАСТРОЛІ БЕЛАСТОЦКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЯЎРЭЙСКАГА ТЭАТРА

У канцы сакавіка пачне работу новастворааны па рашэнню партыі і ўрада Беларускай Рэспублікі Беластоцкі Дзяржаўны яўрэйскі тэатр. Тэатральны калектыў энергічна рыхтуецца да пастаноўкі свайго першага спектакля п'есы «Сям'я Авадзіс» Пераца Маркіша (пастаноўка галоўнага рэжысера тав. Марэўскага).

У цікавым рэпертуары, які рыхтуе тэатр: п'есы «Бура» Шэкспіра, «Натан Мудры» Лесінга і «Блукаючыя зоркі» Шолам Алейхема.

Гэты тэатральны калектыў папоўніцца 13 віднымі артыстамі Бакінскага Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра.

СУСТРЭЧА З ПІСЬМЕННІКАМ П. ГЕРМАНАМ

У Доме народнай творчасці адбылася сустрэча кіраўнікоў гурткоў мастацкай самадзейнасці Беластока і супрацоўнікаў Дома народнай творчасці, з вядомым савецкім пісьменнікам Паўлам Германам. Сустрэча прайшла ў жывой і цёплай абстаноўцы.

Адказны рэдактар
Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.

ВЫПИСКА ИЗ ПОСТАНОВЛЕНИЯ ГОРИСПОЛКОМА

г. Белостока от 29 февраля 1940 года о резком повышении цен и о спекуляции предметами широкого потребления частными торговцами г. Белостока на основании составленных актов горторготделом о спекуляции.

Неоднократной проверкой горторготделом и на основании представленных актов на заседании горисполкома установлено, что частные торговцы:

1. СПЕКТОР Абрам Цалкович, прож. по ул. Заменгофа, № 14
2. ЯБЛОНКА Лейзер, прож. по ул. Советской, № 39
3. ЛОНДОН Герш Яковлевич, прож. по ул. Пролетарской, № 19
4. ГОЛЬДБЕРГ Берта Вольфовна, прож. по ул. Чацкого, № 5.
5. КАПЛАН Михля Абрамовна, прож. по ул. Рыбный Рынок, № 6
6. БУКОВШТЕЙН Либа, прож. по ул. Ленинской, № 24
7. ТОПОЛЯНСКАЯ Нехома, прож. по ул. Ленинской, № 24
8. РОТШТЕЙН Гута Абрамовна, прож. по ул. Хазановича, № 4
9. ЛИПМАН Хаим, прож. по ул. Чкалова, № 5 —

несмотря на ряд предупреждений со стороны торгового отдела гор. Белостока, продавали продукты широкого потребления по резко повышенным спекулятивным ценам:

1 кг. конфект по 80 руб., вместо 4 руб. 50 коп. — 6 руб.; кофе — 12 р. 50 к. вместо 4 р. 50 к. за 1 кг.; шоколад 60 руб. — вместо 28 руб.; мармелад 35 руб. — вместо 18 руб. за 1 кг.; масло сливочное 46 руб. — вместо 14 руб.; швейцарский сыр 50 руб. — вместо 15 руб.' колбаса 25-30 руб. — вместо 8 руб.; крупа ячная 8 руб. — вместо 4 руб. 20 к.; горох 6 руб. — вместо 3 руб. 60 к.; фасоль белая 15 руб. вместо 4 р. 20 к.; овсянка 10 руб. вместо 1 р. 90 к. за килограмм.

Мука, белобулочные изделия также продавались по чрезмерно повышенным ценам.

Вышеупомянутые частные торговцы, присутствуя на заседании горисполкома при рассмотрении этого вопроса, не отрицали факта резкого повышения цен.

Исходя из вышеизложенного, городской исполнительный комитет гор. Белостока постановляет:

За спекуляцию товарами широкого потребления, что в достаточной мере установлено и подтверждено соответствующими актами, составленными инспекторами горторготдела от 27 февраля с. г., ПОДВЕРГНУТЬ ШТРАФУ: 1) СПЕКТОРА А. Ц. — 15.000 руб.; 2) ЯБЛОНКУ Лейзера — 3.000 руб.; 3) ЛОНДОНА Г. Я. — 5.000 руб.; 4) ГОЛЬДБЕРГ Б. В. — 500 руб.; 5) КАПЛАН М. А. — 2.000 руб.; 6) БУКОВШТЕЙН Лейба — 2.000 руб.; 7) ТОПОЛЯНСКУЮ М. — 1.000 руб.; 8) РОТШТЕЙН Г. А. — 5.000 руб., 9) ЛИПМАНА Хаима — 5.000 р.

Обязать вышеперечисленных лиц в течение трехдневного срока со дня вынесения настоящего постановления внести полностью указанные суммы штрафа на счет № 11/5 в Госбанке.

Горисполком предупреждает, что если в указанный срок суммы штрафа не будут погашены, то против нарушителей будут приняты суровые меры административного воздействия.

Председатель Белостокского городского исполнительного комитета
СЕНКЕВИЧ

Отв. секретарь Белостокского городского исполнительного комитета
ОКУНЬ

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Беласток, будынак Аблвыканкома. Тэлефоны рэдакцыі: адказнога рэдактара—22; партаддзела і сакратарыята—23; сельскагаспадарчага, культурнага, літаратуры і мастацтва, школьнага і інфармацыйнага аддзелаў—17.62 выдавецтва і аддзел аб'яў—16-10; друкарня і начная рэдакцыя 5.21. Падпіску на газету прымае Саюздрук тэл. 5.14.

Упаўнаважаны абліта № 263.

1-я дзяржаўная друкарня ў г. Беластоку.